*І.А.Алексніна*

# ШКОЛЬНЫ РЭЛІГІЙНЫ ТЭАТР БЕЛАРУСІ Ў ПАЧАТКУ XX ст.

Школьныя тэатры дастаткова шырока распаўсюджаны на беларускіх землях асабліва ў XVI–XVIII стст. На тэрыторыю нашай краіны яны прыйшлі з Польшчы, куды, адпаведна, – з тэрыторыі Заходняй Еўропы. Што разумеецца пад паняццем “школьны тэатр”? Гэта тэатр пры навучальных установах (акадэміях, калегіумах, брацкіх школах). Асноўнымі мэтамі яго дзейнасці першапачаткова былі авалоданне вучнямі лацінскай мовай і выхаванне, выпрацоўка адпаведных эстэтычных густаў і дабрачыннасцей. «У сваіх вытоках школьныя тэатры звязаны, з аднога боку, з народнымі ігрышчамі, маскараднымі пераапрананнямі, “пацехамі” скамарохаў, з фальклорнай драмай, з другога – з імкненнем царквы надаць тэатралізаваны характар рэлігійнаму абраду, падаць яго ў жывым дзеянні, інсцэніраваць найбольш драматычныя эпізоды Біблії» [3, с. 543].

Значную ролю ў пашырэнні школьных тэатраў на тэрыторыі Беларусі ў XVI–XVIII стст. адыграла дзейнасць езуітаў, якія імкнуліся да пашырэння школьнай адукацыі і выкарыстоўвалі сродкі тэатральнага мастацтва ў мэтах акаталічвання і апалячвання насельніцтва. Езуіцкія школьныя тэатры працавалі ў шэрагу беларускіх вёсак і мястэчак. Сярод найбольш значных – тэатры ў Полацку, Пінску, Гродне, Віцебску, Навагрудку, Мінску, Нясвіжы, Брэсце, Оршы, Слоніме, Бабруйску і інш. Акрамя езуітаў, тэатры пры навучальных установах ладзілі пратэстанты (Слуцк), піяры (Віцебск, Ліда), а з XVIII ст. – уніяты і праваслаўныя вернікі.

Такім чынам, трэба адзначыць, што школьны тэатр для беларусаў – дастаткова традыцыйная з’ява, але, па меркаванні беларускіх тэатразнаўцаў, гэты тэатр спыніў сваю дзейнасць ў XVIII ст. Тым не менш нам пашанцавала знайсці дакументальныя сведчанні аб дзейнасці тэатра школьнага тыпу ў больш позні перыяд, у пачатку XX ст., прычым на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Адзначым, што такі школьны тэатр, які працаваў пры гімназіі імя Стэфана Баторыя пры кляштары беларускіх айцоў марыянаў у мястэчку Друя Браслаўскага павета Віленскай губерні, не з’яўляецца выключэннем для заходнебеларускай тэатральнай культуры 1920– 1930-х гг. На тэрыторыі даследаванага намі

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

Заходняга Паазер’я ў гэты перыяд пры гімназіях працавалі таксама школьныя тэатры, якія мелі рэлігійны (духоўны) напрамак. Самай даследаванай з’яўляецца дзейнасць адзначанага вышэй тэатра, аб якой мы даведаліся дзякуючы выданню ў Ольштыне (Польшча) успамінаў былых удзельнікаў гэтага тэатра (у прыватнасці, А.Савіцкай-Феадаровіч), занатаваных больш як праз палову стагоддзя [1].

Перыяд дзейнасці Друйскага школьнага тэатра марыянскага кляштара датуецца 1924–1939 гг. і характарызуецца садружнасцю польскай і беларускай культур. Друйская гімназія вызначалася высокім узроўнем адукацыі і дэмакратызмам. Дырэктарам гімназіі быў выдатны беларускі дзеяч, біскуп, выкладчык рэлігіі і латыні, ксёндз Анджэй Цікота. Са справаздачы віленскага ваяводы У.Рачкевіча, пададзенай у Міністэрства веравызнанняў і народнай асветы, датаванай 22 чэрвеня 1928 г. [2, с. 76–78], і з прашэння жыхароў Друйскай і навакольных гмін да міністра ўнутраных спраў Польшчы [2, с. 78–81] вынікае, што А.Цікота размаўляў толькі па-беларуску, вёў беларускую агітацыю і супрацоўнічаў з шэрагам выдатных беларускіх дзеячаў, якія жылі ў Латвіі. Акрамя таго, ён часта выязджаў у Латвію, дзе ў час сваіх выступленняў крытыкаваў польскія ўлады, быў непрымальнікам усяго іншанацыянальнага, якое навязвалася насільна. Польская мова ўжывалася ім і іншымі ксяндзамі-выкладчыкамі толькі падчас лекцый. Сярод вучняў гімназіі было 60 % беларусаў, каля 10 % палякаў, астатнія – яўрэі [2, с. 77]. Асоба А.Цікоты і такія “зацятыя беларусы”, як Я.Германовіч (Вінцук Адважны) і К. Смулька, аказвалі вялікае ўздзеянне на светапогляды вучняў гімназіі.

Навучанне ў гімназіі пры кляштары было платным. Аднак найбольш здольных да вучобы дзяцей, незалежна ад саслоў-нага і маёмаснага становішча і веравызнання, бралі пад апеку манахі кляштара. У мэтах паляпшэння вучэбна-выхаваўчай работы і павышэння яе якаснага ўзроўню, актывізацыі і рэалізацыі творчага патэнцыялу навучэнцаў і выкладчыкаў вялікая ўвага надавалася развіццю мастацкай самадзейнасці. Адразу ж пасля адкрыцця школы ствараюцца тэатр і хор, выдаецца рукапісны часопіс вершаваных, празаічных твораў і выяўленчых прац настаўнікаў і вучняў [1].

Ініцыятарам багатага творчага жыцця гімназіі, арганізацыі тэатра, першым яго рэжысёрам быў А.Цікота. Школьны тэатр меў

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

сваю глядзельную залу з добрай сцэнай, трывалыя сувязі з прафесійнымі мастакамі і драматычнымі калектывамі, значную грашовую падтрымку здольных да сцэнічнай справы кіраўнікоў, што станоўча адбівалася на годнасці мастацкага афармлення і мастацка-эстэтычным узроўні пастановак.

Рэпертуар друйскіх аматараў быў (у сваёй большасці) заснаваны на творах навучальнай праграмы, што спрыяла лепшаму замацаванню вучэбнага матэрыялу. Драматургічную аснову для сцэнічных паказаў складалі малавядомыя ў беларускім мастацтвазнаўстве п’есы польскіх аўтараў: “Ноч на святога Яна” (“Купальская ноч”), “Безыменныя волаты”, “Не пакінем зямлі”, “Бальшавікі пад Варшавай”, “Вялікія імправізацыі”, “Сэрца Казіка”, “Віленскія пальмы”, “Веслава”. Ставіліся больш вядомыя творы, напрыклад “Панскія шлюбы”, “Дамы і гусары” А.Фрэдра, “Ночы лістападныя” С.Выспянскага, “Нечаканасць” К.Раствароўскага, “Стану бялейшым, чым снег” С.Жэромскага, “Дзяды”, “Пан Тадэвуш” паводле А.Міцкевіча.

Традыцыйным паказам, які ладзілі гімназісты падчас святкавання каталіцкіх Каляд, была яселка. Прадстаўленне адбывалася ў “жывым выкананні”, без выкарыстання лялек. Вядома, што ў 1927 г. у якасці першакрыніцы для пастаноўкі спектакля выкарыстоўваўся тэкст Л.Рыдлі “Яселка”. У адрозненне ад школьных тэатраў пры кляштарах і калегіумах XVIII ст. у друйскіх паказах не было вольных імправізацыйных сцэн. Фотаздымкі адной з такіх пастановак (1927) прадстаўляюць дзейных асоб: трох каралёў, пастушкоў, анёлаў, Іосіфа, маці Марыю, маленькага Езуса.

Адметнай рысай творчасці калектыву можна назваць актыўны ўдзел у тэатральных выступленнях не толькі гімназістаў, але і прафесараў – будучага польскага пісьменніка А.Голубева, Ст. і С.Заяц, Я.Шулакевіча, Я.Германовіча. Сучаснікі характарызуюць А.Цікоту як здольнага рэжысёра і арганізатара, таленавітага выканаўцу роляў. З ліку навучэнцаў у тэатры ўдзельнічалі Ю.Зубрыцкая, В.Мірская, Г.Цічэўская, В.Ражкова, С.Наркевіч, В.Туронак, Е.Жаба, Ч.Сіповіч, І.Малецкі. Выканаўчы талент апошняга А.Савіцкая-Феадаровіч параўноўвала з ігрой такіх акцёраў, як Запасевіч, Ганушкевіч, Галубок [1].

Акрамя непасрэднай пастановачнай работы, у мэтах авалодання тэхнікай акцёра і павышэння агульнага мастацка-эстэтычнага ўзроўню пастановак рэжысёрамі сістэматычна праводзіліся заняткі

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

па культуры мовы, сцэнічным руху, акцёрскім майстэрстве. У спектаклях школьнага тэатра выкарыстоўвалася музычнае афармленне. Над некаторымі дэкарацыямі да спектакляў працавалі спецыяльна запрошаныя А.Цікотам мастакі з Вільні.

Значны уплыў на творчы рост тэатра аказвалі гастролі прафесійных калектываў. У 1927–1928 гг. на сцэне гімназіі выступаў тэатр пад кіраўніцтвам вядомага польскага акцёра і рэжысёра Юліюша Астэрвы. Былі паказаны спектаклі “Рэдут” і “Птушкі” Шанеўскага, а таксама невядомая нам п’еса А.Карнеля. Кіраўнік тэатра выявіў свой талент не толькі ў якасці рэжысёра-пастаноўшчыка, але і ў паспяховым выкананні галоўных роляў.

Акрамя тэатральных выступленняў, на сцэне гімназіі ладзілі канцэрты спевакі і чытальнікі. Найбольш запамінальнымі былі выступленні Л.Вырвіча і “славутага баса”, які спяваў у італьянскай оперы “Ла Скала”, друяніна Іосіфа Нарушэвіча. Самі ж гімназісты арганізоўвалі пастаноўкі спектакляў па два разы на дзень у нядзелю. Пасля драматычнай часткі ўдзельнікі хору гімназіі прапаноўвалі гледачам паслухаць песні ў іх выкананні, што па кампазіцыйнай пабудове нагадвае форму славутых “беларускіх вечарынак”, якія ладзіў І.Ц.Буйніцкі. Выступленні тэатра карысталіся вялікім поспехам не толькі ў Друі, Браславе, але і ў невялікіх вёсках. Поспех стацыянарных і гастрольных пастановак можна абгрунтаваць, з аднога боку, цікавасцю людзей да іх, з другога – дастаткова высокім для адукацыйнай установы ўзроўнем выканання [1].

Вялікая адраджэнская нацыянальная праца, распачатая А.Цікотам і яго паплечнікамі, іх імкненне да пабудовы незалежнай беларускай дзяржавы выклікалі незадаволенасць і рэлігійных, і свецкіх улад. Гэта вынікае з дакументаў Варшаўскага архіва новых актаў, ксеракопіі якіх былі дасланы польскім даследчыкам Ю.Туронкам у Браслаўскі краязнаўчы музей. Дзейнасць ксяндзоў-марыянаў, якія разглядалі кляштар і парафію як беларускую пляцоўку, прыхільнікі паланізацыі лічылі “антыдзяржаўнай” [2, с. 82], што ў 1939 г. прывяло да высылкі манахаў з Друі, закрыцця кляштара і гімназіі, а значыць, і самаліквідацыі тэатра. На жаль, многіх з прафесараў і вучняў гімназіі напаткаў трагічны лёс, а пасля ўключэння Друі ў склад Савецкай Беларусі большасць насельніцтва Браслаўскага раёна выехала ў Польшчу. І сёння 80% эмігрантаў з Браслаўшчыны жывуць на тэрыторыі Ольштынскага ваяводства,

БІБЛІЯТЭКА БДУКІ

што замінае вывучэнню пытання дзейнасці школьных тэатраў Заходняй Беларусі пачатку XX ст.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што школьны тэатр у Друі пры кляштары марыянаў адыграў важную ролю ў выхаванні і духоўным развіцці ўдзельнікаў тэатра. Дэмакратызм, удзел у рабоце тэатра і вучняў-гімназістаў, і прафесараў, высокі ўзровень арганізацыі працы, матэрыяльнае забеспячэнне, высакаякасная драматургія, грунтаванне рэпертуару на класічных узорах літаратуры (нават польскай), уключэнне ў паказы пластычных нумароў і спеваў хору (салістаў), сувязь з прафесійнымі калектывамі, гастрольная дзейнасць – усё гэта, па сведчанні выпускніцы гімназіі А.Савіцкай-Феадаровіч, “нараджала ... імкненне, павагу да прыгожага, рабіла нас лепшымі”, дапамагала самараскрыццю і самаразвіццю асоб удзельнікаў тэатра і гледачоў, спрыяла росту іх духоўнасці. Нездарма сярод выпускнікоў гімназіі – удзельнікаў работы тэатра – былі такія сусветна вядомыя асобы, як рэлігійны дзеяч, біскуп, заснавальнік бібліятэкі імя Ф.Скарыны ў Лондане Ч.Сіповіч, мастак В.Жаўняровіч, філосафы-тэолагі Т.Падзява, В.Петкун і інш.

1. *Alma* mater druiensis: Wspajały w dusze ideały nigdy nie odeszlismy od ciebie. – Olsztyn, 1986. – № 3. – Cz. 2. – 327 s.

2. *Туронак Ю.* Да гісторыі Друйскага марыянскага манастыра // Браслаўскія чытанні: Матэрыялы IV навук.- краязн. канф., 24 – 25 крас. – Браслаў, 1997. – С. 76 – 82.

3. *Тэатральная* Беларусь: Энцыклапедыя: У 2 т. – Мн.: БелЭн, 2003. – Т. 2. – 576 с.: іл.

БИБЛИОТЕКА БГПУ